ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

11 кастрычніка 2015 г.

**КАМПАНІЯ «ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ»**

# АНАЛІТЫЧНАЯ СПРАВАЗДАЧА ПА ВЫНІКАХ НАЗІРАННЯ

ЗМЕСТ


Высновы

Уводзіны

Умовы назірання

Прававая база

Выбарчыя камісіі

Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў

Перадвыбарчая агітацыя

Датэрміновае галасаванне

Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыкаў

Галасаванне на выбарчых участках і падлік галасоў

Скаргі і звароты, звязаныя з выбарамі

Рэкамендацыі

Спіс прынятых скарачэнняў


## ВЫСНОВЫ

Прэзідэнцкія выбары 2015 г. пачаліся ў ліпені ў абставінах, неспрыяльных для правядзення свабодных і дэмакратычных выбараў: у месцах пазбаўлення волі заставаліся палітычныя вязні, сістэматычна праследаваліся незалежныя журналісты, што, разам з іншымі фактарамі, негатыўна ўплывала на палітычную сітуацыю ў краіне.

Пасля вызвалення палітычных зняволеных у жніўні 2015 г. вызначыліся станоўчыя тэндэнцыі: з’явілася больш магчымасцяў для рэалізацыі грамадзянскіх і палітычных правоў падчас перадвыбарчай кампаніі, зніклі перашкоды з боку ўлады пры зборы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў у прэзідэнты і правядзенні агітацыйных мерапрыемстваў.

Улады Беларусі не чынілі рэпрэсій і не стваралі перашкод непасрэдна падчас масавых мерапрыемстваў, якія праводзіла частка апазіцыі па-за межамі выбарчага заканадаўства. Але арганізатарам такіх мерапрыемстваў пазней былі прысуджаны значныя штрафы, што парушае права на мірныя сходы, гарантаванае міжнароднымі прававымі актамі.

Аднак **выбарчы працэс не адпавядаў шэрагу асноўных міжнародных стандартаў правядзення дэмакратычных і свабодны выбараў**. Гэта было абумоўлена адсутнасцю роўнага доступу да сродкаў масавай інфармацыі для ўсіх кандыдатаў, адсутнасцю бесстаронніх выбарчых камісій, актыўным выкарыстаннем адміністратыўнага рэсурса на карысць дзеючага Прэзідэнта, шматлікімі фактамі прымусу выбаршчыкаў да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні, закрытасцю шэрагу выбарчых працэдур для назіральнікаў.

Найбольш важнай падставай для крытыкі выбараў застаецца адсутнасць празрыстасці падліку галасоў, што не дазваляе лічыць абвешчаныя вынікі выбараў адлюстраваннем волевыяўлення выбаршчыкаў.

**Выбарчыя камісіі**

Пры фарміраванні камісій быў відавочны дыскрымінацыйны падыход да прадстаўнікоў апазіцыйных партый з боку органаў, якія ўтвараюць камісіі. Агульная колькасць прадстаўнікоў апазіцыйных партый у ТВК склала 10 чалавек, альбо 0,5 % ад агульнага складу ТВК; іх колькасць у УВК склала 31 чалавек, альбо 0,046 % ад агульнага складу сяброў УВК, што ў пяць разоў менш, чым на папярэдніх прэзідэнцкіх выбарах.

Адсутнасць заканадаўча замацаваных крытэраў для ўключэння ў выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў, робіць магчымым селектыўнасць падыходу да іх фарміравання. Адсутнасць такіх крытэраў таксама робіць неэфектыўнай норму ВК, што прадугледжвае магчымасць судовага абскарджання рашэнняў аб адмове ва ўключэнні ў іх склад.

Нязначная колькасць прадстаўнікоў палітычных партый у складзе выбарчых камісій адлюстроўвае спецыфіку беларускай палітычнай мадэлі, пры якой асноўнымі палітычнымі суб'ектамі пры правядзенні выбарчых кампаній выступаюць прадстаўнікі праўрадавых грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў.

**Вылучэнне і рэгістрацыя кандыдатаў**

Дакументы на рэгістрацыю падалі 15 ініцыятыўных груп грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты, ЦВК зарэгістравала 8 з іх. Рашэнні мясцовых выканаўчых органаў адносна месцаў, забароненых для пікетавання з мэтай збору подпісаў, істотна не абмежавалі магчымасці працы ініцыятыўных груп у публічных месцах, аднак многія рашэнні не былі абумоўлены патрабаваннямі бяспекі і грамадскага парадку.

Улады не чынілі істотных абмежаванняў пры зборы подпісаў, але роля выканаўчай вертыкалі ўлады і адміністрацый дзяржаўных прадпрыемстваў па-ранейшаму заставалася вельмі вялікай. Збор подпісаў за вылучэнне ў якасці кандыдата ў прэзідэнты А. Лукашэнкі суправаджаўся актыўным выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу: ажыццяўляўся ў працоўны час, на тэрыторыі прадпрыемстваў і ўстаноў, часта пры непасрэдным удзеле адміністрацый гэтых прадпрыемстваў і ўстаноў.

Непразрыстасць працэдуры праверкі подпісаў і дакументаў дае падставы разглядаць вынік рэгістрацыі як палітычна матываваны. Кандыдатамі ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь зарэгістраваныя А. Лукашэнка, Т. Караткевіч, С. Гайдукевіч, М. Улаховіч.

**Перадвыбарчая агітацыя**

Перадвыбарчая агітацыя не стала значнай палітычнай кампаніяй для беларускага грамадства. Яна прайшла малазаўважна для выбаршчыкаў. Недахоп візуальных сродкаў агітацыі за кандыдатаў у прэзідэнты, відавочна, абумоўлена невысокай актыўнасцю большасці

кандыдатаў і іх прыхільнікаў, а таксама адменай дзяржаўнага фінансавання вырабу інфармацыйных матэрыялаў.

У некаторых гарадах краіны, у тым ліку ў сталіцы, створаны адносна спрыяльныя ўмовы для агітацыі. Пры гэтым многія назіральнікі ў рэгіёнах адзначаюць, што мясцовыя ўлады вызначылі зусім непрыдатныя месцы для агітацыйных масавых мерапрыемстваў.

Галоўнымі ўдзельнікамі выбарчага працэсу заставаліся дзейсны прэзідэнт і Цэнтральная выбарчая камісія. Паводле адведзенага эфірнага часу і газетнай плошчы А. Лукашэнка знаходзіўся па-за канкурэнцыяй.

На карысць дзейснага прэзідэнта актыўна прымяняўся адміністрацыйны рэсурс. Праўрадавыя грамадскія арганізацыі, якія фінансуюцца з бюджэта (ФПБ, БРСМ і іншыя), актыўна праводзілі грамадска-палітычныя мерапрыемствы пад характэрнай сімволікай і ў кантэксце выбарчай праграмы дзейснага прэзідэнта, што атаясамлялася ў свядомасці выбаршчыкаў з агітацыяй у яго падтрымку. Гэтыя мерапрыемствы не фінансаваліся з выбарчага фонду кандыдата, што з’яўляецца парушэннем устаноўленага парадку агітацыі.

**Датэрміновае галасаванне**

У датэрміновым галасаванні прынялі ўдзел 36,05 % выбаршчыкаў – найбольшая колькасць з улікам папярэдніх прэзідэнцкіх кампаній 2001, 2006 і 2010 гг. Фактычна датэрміновае галасаванне ператварылася ў норму, што не адпавядае патрабаванням ВК.

Падчас датэрміновага галасавання назіральнікамі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» былі зафіксаваны шматлікія факты прымусу грамадзян да ўдзелу ў ім з боку адміністрацый прадпрыемстваў і ВНУ. Гэта паўтарыла негатыўную практыку папярэдніх выбарчых кампаній.

Адзначаны выпадкі завышэння яўкі выбаршчыкаў на некаторых выбарчых участках. Абагульненая розніца на 144 УВК, на якіх праводзілася назіранне, па колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні, па дадзеных назіральнікаў і УВК склала 6,2%. Пры гэтым на некаторых УВК розніца складала больш за 50%.

Практыка правядзення датэрміновага галасавання застаецца адной з сістэмных праблем выбарчага працэсу, стварае шырокія магчымасці для выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу і іншых маніпуляцый.

**Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыкаў**

Дзейсныя працэдуры галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў даюць магчымасці для маніпуляцый. Назіральнікі не могуць праверыць, ці сапраўды паступалі заяўкі выбаршчыкаў аб арганізацыі галасавання па месцы знаходжання, паколькі заканадаўства прадугледжвае не толькі пісьмовую, але і вусную форму такой заяўкі.

Адзначаліся выпадкі, калі выбаршчыкі не звярталіся з просьбай аб арганізацыі галасавання па месцы знаходжання і паведамлялі гэта сябрам УВК, якія ўжо прыйшлі да іх са скрыняй. Часам назіральнікам не давалі інфармацыі аб колькасці выбаршчыкаў, унесеных у спіс для галасавання па месцы знаходжання. Неаднаразова адзначана, што колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі па месцы свайго знаходжання, не супадае з колькасцю скарыстаных для гэтага бюлетэняў.

**Галасаванне на выбарчых участках і падлік галасоў**

Па-ранейшаму застаюцца закрытымі для назіральнікаў спісы выбаршчыкаў на ўчастках. Не створаны адзіны рэестр выбаршчыкаў. Гэта стварае ўмовы для маніпуляцый з яўкай.

У заканадаўстве не прапісаны метад падліку бюллетэняў участковымі выбарчымі камісіямі. Для падліку галасоў не прымяняецца дакладная працэдура, пры якой адзнака на кожным бюлетэні абвяшчаецца ўслых з дэманстрацыяй бюлетэня ўсім прысутным сябрам УВК і назіральнікам.

Падлік галасоў на выбарчых участках шмат у чым паўтарыў негатыўную практыку непразрыстага падліку бюлетэняў. Больш за палову назіральнікаў былі пастаўлены камісіямі ў нязручныя для назірання ўмовы, 76,9 % не маглі бачыць змест бюлетэняў. Толькі 12,2 % скаргаў, пададзеных назіральнікамі, былі разгледжаны на пасяджэннях УВК.

**Абскарджванне парушэнняў выбарчага заканадаўства**

Звароты і скаргі па фактах парушэнняў ВК падчас розных этапаў выбарчай кампаніі не мелі заўважнага ўплыву на практыку правядзення выбарчых працэдур. У асобных выпадках скаргі ў ЦВК на парушэнні падчас фармавання выбарчых камісій прыводзілі да заменаў у іх складзе. Аднак назіральнікам невядома ні аднаго выпадку, калі б задавальняліся скаргі на грубыя парушэнні на этапе галасавання і падліку галасоў.

Органы пракуратуры, як і на мінулых выбарах, ухіляліся ад разгляду скаргаў па сутнасці, абмяжоўваючы свой удзел, у лепшым выпадку, перанакіраваннем іх ў выбарчыя камісіі.

Суды адмаўляліся разглядаць скаргі, у тым ліку на дзеянні выбарчых камісій, калі такія скаргі не тычыліся прама прадугледжаных у ВК выпадкаў.

## УВОДЗІНЫ

Кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» – незалежная і палітычна незаангажаваная сумесная ініцыятыва Праваабарончага цэнтра «Вясна» і Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб’яднання «Беларускі Хельсінкскі камітэт».

Мэта кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» – назіранне за выбарамі, ацэнка выбарчага працэсу з пункту гледжання беларускага выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, інфармаванне беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці аб выніках назірання.

З першага дня выбараў у межах кампаніі дзейнічала 55 доўгатэрміновых назіральнікаў. Назіральнікі былі прадстаўлены ў такой колькасці ТВК, якая ахоплівае больш за 70% выбаршчыкаў краіны. Вынікі апрацоўкі штотыднёвых справаздач назіральнікаў

распаўсюджваліся ў форме тыднёвых справаздач кампаніі і папярэдніх справаздач кампаніі па асобных этапах выбараў.

Падчас датэрміновага галасавання і галасавання ў дзень выбараў назіранне ажыццяўлялі 450 кароткатэрміновых назіральнікаў на 400 выбарчых участках па ўсёй тэрыторыі краіны. Іх штодзённыя справаздачы апрацоўваліся, што дазволіла выявіць агульныя тэндэнцыі ў арганізацыі выбарчага працэсу і зафіксаваць узровень парушэнняў ВК.

## УМОВЫ НАЗІРАННЯ

Міжнароднае назіранне ў Беларусі традыцыйна было прадстаўлена Міжнароднай місіяй БДІПЧ АБСЕ, Назіральнай місіяй Парламенцкай Асамблеі СНД, місіяй Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, прадстаўнікамі дыпламатычнага корпусу ў Рэспубліцы Беларусь. Таксама нешматлікія місіі міжнароднага назірання былі накіраваны Парламенцкай асамблеяй АБСЕ, Шанхайскай Арганізацыяй Садружнасці.

Нацыянальнае назіранне акрамя кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», ажыццяўляла таксама кампанія «Права выбару – 2015», якая аб'яднала восем палітычных суб'ектаў і можа лічыцца назіраннем з боку апазіцыйных палітычных партый і рухаў. Таксама працавалі назіральнікі двух палітычных апазіцыйных суб'ектаў «За справядлівыя выбары».

Некаторыя праўладныя грамадскія аб'яднанні і палітычныя партыі (Белая Русь, БРСМ, Беларускі саюз жанчын, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі і інш.) вылучылі назіральнікаў. Аднак даклады або справаздачы па выніках іх дзейнасці не былі прадстаўлены грамадству.

У працэсе назірання за выбарамі назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» сутыкаліся з фактамі перашкодаў з боку органаў улады, адмовамі ў прадстаўленні інфармацыі з выбарчых камісій, выдаленнем з выбарчых участкаў. Асобна трэба адзначыць неабгрунтаваную забарону на фота- і відэаздымкі на выбарчых участках, супрацьдзеянне назіральнікам падчас падліку яўкі на выбарчыя ўчасткі.

## ПРАВАВАЯ БАЗА

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прызначаны Пастановай Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь 30 траўня 2015 г. на 11 кастрычніка 2015 г. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь рэгулююцца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь, пастановамі Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь, пастановамі мясцовых органаў улады.

АБСЕ неаднаразова адзначала «шматлікія істотныя недахопы» Кодэкса і давала рэкамендацыі па яго ўдасканаленні. Акрамя таго, у 2007 і 2008 гг. Генеральная Асамблея

ААН звяртала да Беларусі «настойлівы заклік прывесці выбарчы працэс і заканадаўчую базу ў адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі і ліквідаваць недахопы выбарчага працэсу».

Згодна з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам, «выбары Прэзідэнта прызначаюцца Палатай прадстаўнікоў не пазней, чым за пяць месяцаў, і праводзяцца не пазней, чым за два месяцы да заканчэння тэрміну паўнамоцтваў папярэдняга Прэзідэнта».

У першыя дні пачатку кампаніі ЦВК прыняла пакет пастановаў і іншых дакументаў па арганізацыі і падрыхтоўцы выбараў, якія істотна не адрозніваўся ад аналагічнага пакета, зацверджанага напярэдадні выбараў 2010 г.

ЦВК не прыняла тых прапаноў, рэалізацыя якіх спрыяла б транспарэнтнасці і справядлівасці выбарчага працэсу. Гэта прапановы аб публікацыі вынікаў галасавання па кожным выбарчым участку краіны, выдачы заверанай копіі выніковага пратаколу назіральнікам, гарантавання празрыстага падліку галасоў. Такія змены ініцыявала ў ЦВК кампанія «Праваабаронцы за свабодныя выбары» з абгрунтаваннем, што яны не вымагаюць зменаў ВК, а толькі ўдасканалення практыкі яго прымянення, што цалкам знаходзіцца ў межах паўнамоцтваў ЦВК.

Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2015 г. – першыя пасля чарговых зменаў ВК, унесеных у 2011, 2013 і 2015 гг. Асноўнымі з гэтых зменаў з'яўляюцца:

• кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь атрымалі права ствараць уласныя выбарчыя фонды для фінансавання дадатковых выдаткаў па перадвыбарчай агітацыі ў памеры не больш 9000 базавых адзінак з моманту рэгістрацыі ініцыятыўнай групы кандыдата;

• уведзена адміністратыўная адказнасць за заклік да байкоту выбараў;

• уведзена забарона на рэгістрацыю ініцыятыўных груп грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты асобамі, якія знаходзяцца пад вартай, альбо адбываюць пакаранне, звязанае з пазбаўленнем волі.

Змены і дапаўненні ў ВК у асноўным носяць негатыўны характар у параўнанні са зменамі 2010 г. і не ўлічваюць рэкамендацыі экспертаў АБСЕ, нацыянальных незалежных назіральнікаў, апазіцыйных партый Беларусі. Засталіся не рэалізаванымі многія рэкамендацыі, у тым ліку, не былі прыняты меры па павышэнні празрыстасці выбарчага працэсу. Не былі ўсталяваны нормы, якія забяспечваюць галосны публічны падлік галасоў. Не быў усталяваны абавязак старшыні і сакратара выбарчай камісіі выдаваць копіі пратакола аб выніках галасавання тым асобам, якія маюць права прысутнічаць падчас падліку галасоў на ўчастку для галасавання. Такім чынам, недахопы рэгулявання тых працэдур выбарчага працэсу, якія ў найбольшай ступені могуць выкарыстоўвацца для фальсіфікацый і злоўжыванняў, захоўваюцца.

Як станоўчы момант трэба адзначыць Пастанову Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 01.07.2015 г. №26 «Аб стварэнні дадатковых умоваў для галасавання выбаршчыкаў з парушэннем зроку пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

## ВЫБАРЧЫЯ КАМІСІІ

ЦВК дзейнічае на пастаяннай аснове. У яго склад уваходзяць 12 сяброў, 6 з іх прызначае прэзідэнт, 6 – вылучае Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу з кандыдатур, рэкамендаваных прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і адпаведнымі выканаўчымі камітэтамі. У дзеючым складзе ЦВК толькі тры сябры не з'яўляюцца дзяржаўнымі

служачымі. Такім чынам, парадак фарміравання ЦВК і яе склад, а таксама неаднаразовыя праявы лаяльнасці да дзейснага прэзідэнта з боку яе кіраўніка і сяброў, дазваляюць меркаваць, што ЦВК не з’яўляецца незалежным органам.

**ТВК**

Згодна з выбарчым заканадаўствам, ТВК фарміруюць выканкамы і адміністрацыі раёнаў у гарадах. Усе яны з’яўляюцца часткай уладнай «вертыкалі» дзейснага прэзідэнта, як і мясцовыя Саветы дэпутатаў, абраныя ў ходзе мясцовых выбараў 2014 г., што не былі свабоднымі і справядлівымі.

Вылучэнне кандыдатур у склад ТВК для палітычных партый, грамадскіх аб’яднанняў, працоўных калектываў і групаў грамадзян было свабодным. Паводле дадзеных ЦВК, усяго было вылучана 2623 кандыдаты. Меншую частку прэтэндэнтаў у склад ТВК склалі прадстаўнікі партый – 9,2%. Такое становішча сведчыць аб захаванні невысокай ролі партый у палітычным жыцці дзяржавы.

З 15 зарэгістраваных у краіне палітычных партый сваіх прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных камісій вылучылі 9, у тым ліку 4 апазіцыйных: Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» (39), Аб'яднаная грамадзянская партыя (10), Партыя БНФ (11), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) (3). Усяго прадстаўнікоў апазіцыйных партый было 63. Працэс вылучэння ўскладняўся тым, што, у адпаведнасці з ВК, правам вылучэння сваіх прадстаўнікоў валодаюць толькі кіруючыя органы абласных, Мінскіх гарадскіх, раённых, гарадскіх (у гарадах абласнога падпарадкавання), раённых у гарадах арганізацыйных структур палітычных партый. За перыяд з 2003 г. многія арганізацыйныя структуры палітычных партый былі ліквідаваныя ў сувязі з рэгістрацыяй у памяшканнях жылога фонду.

Трацiну прэтэндэнтаў у сябры ТВК склалі прадстаўнікі 5 грамадскіх аб’яднанняў: ГА «Белая Русь», ГА «БРСМ», ФПБ, Беларускі саюз жанчын, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў. Большасць сяброў ТВК, як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, – гэта вылучэнцы працоўных калектываў (11,3%), грамадзян (33,4%) і грамадскіх аб'яднанняў (47,5%). Пры гэтым 81% вылучаных прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў у ТВК прадстаўлены пяццю найбуйнейшымі праўладнымі грамадскімі аб'яднаннямі (БРСМ, «Белая

Русь», ФПБ, Саюз жанчын, Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў). Члены гэтых арганізацый складаюць 38,8% усіх сябраў ТВК.







Пасяджэнні органаў, фарміраваўшых ТВК, адбываліся часам ва ўмовах абмежаванасці інфармацыі аб іх месцы і часе. У некаторых рэгіёнах (амаль уся Віцебская вобласць) – ва ўмовах абмежаванага доступу для назіральнікаў. У большасці выпадкаў назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» атрымалі магчымасць прысутнічаць пры правядзенні паседжанняў органаў, фарміраваўшых ТВК, аднак у 20% выпадкаў ім было адмоўлена.

Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, правядзенне пасяджэнняў насіла фармальны характар і фактычна зводзіліся да безальтэрнатыўнага зацвярджэння спісаў складу камісій, распрацаваных мясцовымі органамі ўлады напярэдадні пасяджэнняў. У большасці выпадкаў склад ТВК зацвярджаўся за 10-20 хвілін. Амаль у 80% выпадкаў абмеркавання прапанаваных кандыдатур не вялося, самі прэтэндэнты не прадстаўляліся, ніякія характэрыстыкі ім не даваліся (у 73% выпадкаў). Часцей за ўсё галасаванне адбывалася па загадзя прадстаўленаму спісу кандыдатаў (у 68% выпадкаў). З усіх назіраных пасяджэнняў, у 64% выпадкаў зацікаўленыя асобы не мелі магчымасці азнаёміцца з матэрыяламі па вылучэнні ў склад ТВК (пратаколамі сходаў адпаведных структур палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў і працоўных калектываў, заявамі грамадзянаў).

Абгрунтаванні прынятых рашэнняў аб уключэнні альбо не ўключэнні прэтэндэнтаў у склад камісій размяшчаліся на сайтах толькі некаторых абласных выканкамаў і практычна адсутнічалі на сайтах раённых і гарадскіх выканаўчых камітэтаў.

Суб'екты, якія вылучылі свайго прадстаўніка ў склад камісіі, маюць права абскардзіць рашэнне адпаведнага органа ў судзе. Аднак, як паказвае практыка папярэдніх выбараў, адсутнасць заканадаўча замацаваных крытэраў адбору прэтэндэнтаў у ТВК робіць дадзеную норму пазбаўленай сэнсу. Пры разглядзе скаргаў суды не давалі ацэнку таму, ці адпавядаў пэўны прэтэндэнт вызначаным патрабаванням і крытэрам, і па якой прычыне перавага была аддадзена іншаму прэтэндэнту.

Напрыклад, 23 ліпеня Гомельскі абласны суд разгледзеў скаргу старшыні абласнога камітэта Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Уладзіміра Сякеркі на рашэнне Гомельскага аблвыканкама і абласнога Савета дэпутатаў аб адмове ва ўключэнні у склад абласной выбарчай камісіі прадстаўніка партыі Віктара Хоміча. Суд адмовіў у задавальненні скаргі. Варта адзначыць, што Віктар Хоміч мае значны досвед грамадскай дзейнасці, быў дэпутатам Вярхоўнага Савета 13-га скліканння, дэпутатам абласнога савета, працаваў у шматлікіх

камісіях. У той жа дзень суд Кастрычніцкага раёна г. Віцебска адмовіў у скарзе грамадзян на рашэнне Віцебскага гарвыканкама аб адмове ўключыць у склад ТВК Першамайскага раёна г. Віцебска праваабаронцу Паўла Левінава, якога вылучала туды група грамадзян. Такое ж рашэнне было прынята ў гэты дзень Віцебскім абласным судом па скарзе групы грамадзян, што вылучалі Паўла Левінава ў склад Віцебскай абласной камісіі.

Усяго ЦВК сфарміравала 153 тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, у якія ўвайшлі 1 916 сябраў. Колькасць прадстаўнікоў апазіцыйных партый у ТВК склала 10 з 63 прэтэндэнтаў, ці 0,5% ад агульнай колькасці сяброў ТВК. Такім чынам, «праходнасць» апазіцыйных прэтэндэнтаў склала 15,8 %, а ў прэтэндэнтаў ад праўладных партый – 70 %, у прэтэндэнтаў ад пяці пералічаных ГА – 87,5 %.




У большасці выпадкаў у склад камісій увайшлі па 2–4 дзяржаўныя службоўцы, у тым ліку супрацоўнікі выканкамаў і адміністрацый, – структур, якія яе сфарміравалі. Астатнія – прадстаўнікі праўрадавых грамадзянскіх арганізацый, бюджэтных арганізацый, а таксама кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў.

**УВК**

У адпаведнасці з артыкулам 27 Выбарчага кодэкса, падрыхтоўку і правядзенне выбараў Прэзідэнта разам з тэрытарыяльнымі выбарчымі камісіямі (ТВК), забяспечваюць участковыя выбарчыя камісіі (УВК). Менавіта УВК арганізуюць галасаванне, падлік галасоў і вызначэнне вынікаў галасавання на выбарчых участках, што робіць іх адным з асноўных механізмаў выбарчага працэсу. На этапе агітацыі УВК накіроўвае выбаршчыкам інфармацыю пра кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь; кантралюе на тэрыторыі ўчастка для галасавання выкананне правілаў размяшчэння агітацыйных матэрыялаў. УВК разглядае заявы і скаргі па пытаннях падрыхтоўкі выбараў, арганізацыі галасавання, падліку галасоў і прымае па іх рашэнні.

УВК фарміруюцца раённымі, гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, а ў гарадах з раённым падзелам – мясцовымі адміністрацыямі ў складзе 5-19 членаў. Як і тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, УВК складаюцца з прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў, а таксама прадстаўнікоў грамадзян, вылучаных у склад

камісій шляхам збору подпісаў. Суб'екты, якія вылучылі свайго прадстаўніка ў склад камісіі, маюць права абскардзіць рашэнне адпаведнага органа ў раённым, гарадскім судзе.

Магчымасці вылучэння ў склад УВК ад палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў, як і раней, абмяжоўваліся патрабаваннем наяўнасці арганізацыйных структур. Рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні, якія не маюць арганізацыйных структур у абласцях, наогул пазбаўлены магчымасці вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій.

Фарміраванне УВК прайшло ў адпаведнасці з тэрмінамі, усталяванымі ВК і Каляндарным планам па арганізацыі выбараў. Інфармацыя пра месца і час прыёму дакументаў была паўсюдна размешчана на сайтах выканаўчых камітэтаў у адпаведных раздзелах. Звестак аб парушэннях, звязаных з прыёмам дакументаў аб вылучэнні прадстаўнікоў адпаведнымі суб'ектамі, не было.

Паўсюдна выконвалася фармальная працэдура ўтварэння УВК. Адмоваў у прыёме дакументаў па вылучэнні прадстаўнікоў у склад УВК зафіксавана не было. Усе зацікаўленыя асобы здолелі падаць неабходныя дакументы і былі праінфармаваныя пра час і месцы іх прыёму.

Як і падчас папярэдніх выбарчых кампаній, працягласць пасяджэнняў органаў, якія ўтвараюць камісіі, была мінімальнай. Абмеркавання складу УВК выканаўчымі камітэтамі ці мясцовымі адміністрацыямі у 88,1% назіраных выпадкаў увогуле не адбывалася; у 93% назіраных пасяджэнняў не прадстаўляліся прэтэндэнты, ім не давалася характарыстыка. Так, пасяджэнне выканкама Бярозаўскага раёна доўжылася 8 хвілін, за якія былі разгледжаны 489 кандыдатур; пасяджэнне Гродзенскага райвыканкама – 13 хвілін, за якія былі зацверджаны 448 сябраў УВК. За 15 хвілін адміністрацыя Чыгуначнага раёна г. Гомеля разгледзела 919 кандыдатур і ўключыла 843 чалавекі ў склад УВК. У большасці выпадкаў галасаванне адбывалася за ўвесь загадзя падрыхтаваны выканкамам спіс (у 88,9% назіраных пасяджэннях).

Былі і выключэнні: пасяджэнне ў адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Віцебска доўжылася 5 гадзін 40 хвілін, Першамайскага раёна г. Віцебска – 3 гадзіны 26 хвілін раёнаў г. Віцебска, Аршанскага раёна – 3 гадзіны 10 хвілін. Там сябры адміністрацый і райвыканкамаў спачатку галасавалі па кожнай асобнай кандыдатуры, не ўключанай у склад кожнага стваранага УВК, а пасля за ўвесь спіс уключаных у склад камісій. Пры гэтым асабістыя якасці, як уключаных, так і не ўключаных у склад УВК не абмяркоўваліся, прычыны адмоў ва ўключэнні ў камісіі не называліся.

Прадстаўнікі, якія прысутнічалі на пасяджэннях па ўтварэнні УВК у большасці выпадкаў не мелі магчымасці задаваць пытанні, ім не прапаноўвалі для азнаямлення матэрыялы па вылучэнні ў склад УВК (пратаколы сходаў, заявы грамадзян) (у 58% выпадкаў). У некаторых выпадках назіральнікі ўвогуле былі пазбаўлены магчымасці прысутнічаць на пасяджэннях. Адсутнасць выразна сфармуляваных крытэраў па-ранейшаму дазваляе мясцовым органам улады фарміраваць УВК выключна сыходзячы з уласных меркаванняў.

У сёлетняй выбарчай кампаніі было сфарміравана 6 080 участковых выбарчых камісій. З 76 791 прадстаўніка, вылучанага ў склад УВК палітычнымі партыямі, грамадскімі аб’яднаннямі, працоўнымі калектывамі і групамі, былі вылучаны толькі 3 826 прадстаўнікоў, 515 з якіх – апазіцыйнымі.

У склад 6 080 УВК на тэрыторыі Беларусі ўключана 66 941 сяброў. З 515 кандыдатаў ад апазіцыйных палітычных партый у камісіі ўвайшоў толькі 31 чалавек, што складае 6% ад вылучаных (у 2010 г. гэты паказчык быў амаль у тры разы большы і складаў 17,1%). У той жа час «праходнасць» у УВК прадстаўнікоў ад лаяльных уладзе партый дасягнула 86,4%, а

прадстаўнікоў ад ГА «Белая Русь», ГА «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Беларускага саюза жанчын і Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў – 92%.




Прадстаўнікі апазіцыйных партый склалі 0,046 % (у 2010 г. – 0,25 %) ад агульнай колькасці сяброў УВК і ўвайшлі менш чым у 0,5 % (у 2010 г. – 3%) УВК. Большасць з астатніх сяброў УВК хаця б аднойчы ўваходзіла ў склад УВК на мінулых мясцовых, парламенцкіх ці прэзідэнцкіх выбарах. Назіральнікамі адзначаны шматлікія выпадкі фарміравання УВК з ліку прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыва, прызначэння на кіруючыя пасады ў гэтых УВК кіраўнікоў гэтых працоўных калектываў.

У Мінску і ў Магілёўскай вобласці апазіцыйныя партыі ў УВК наогул не прадстаўленыя; па адным прадстаўніку апазіцыі ёсць ва ўсіх УВК Гомельскай (1070 камісій) і Гродзенскай вобласці (692 камісіі), два ў Мінскай вобласці (на 1032 камісіі).

Такім чынам, працэс фарміравання ТВК і УВК практычна не адрозніваўся ад аналагічнага працэсу падчас папярэдніх прэзідэнцкіх, парламенцкіх і мясцовых выбараў. Яго вынік не дазваляе лічыць створаныя камісіі бесстароннімі і неперадузятымі.

## ВЫЛУЧЭННЕ І РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

Этап вылучэння і рэгістрацыі кандыдатаў у прэзідэнты ўключае вызначэнне месцаў, забароненых для пікетавання з мэтай збору подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў, рэгістрацыю ініцыятыўных груп, збор подпісаў выбаршчыкаў, праверку сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, рэгістрацыю кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

### Рэгістрацыя ініцыятыўных груп

У ЦВК паступілі дакументы аб рэгістрацыі 15 ініцыятыўных груп грамадзян па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты (А. Лукашэнкі, С. Калякіна, С. Гайдукевіча, А. Конаўца, Т. Караткевіч, А. Лябедзькі, М. Статкевіча, Ж. Раманоўскай, І. Першынай, С. Заблоцкага, Т. Біруковай, У. Цярэшчанкі, М. Улаховіча, А. Юдаева, В. Талмачова). Рашэнне аб рэгістрацыі прынята адносна васьмі ініцыятыўных груп (А. Лукашэнкі, С. Калякіна, С. Гайдукевіча, Т.

Караткевіч, А. Лябедзькі, Ж. Раманоўскай, У. Цярэшчанкі, М. Улаховіча). Адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўных груп былі абгрунтаваныя нормамі выбарчага заканадаўства.

Ініцыятыўнай групе палітвязня Мікалая Статкевіча адмоўлена ў сувязі з неадпаведнасцю асобы, якая вылучаецца кандыдатам у прэзідэнты, крытэрам канстытуцыйнай нормы (адсутнасць выбарчага права ў асобы, якая знаходзіцца ў месцах пазбаўлення волі). Акрамя таго, ЦВК устанавіла, што заява аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы Статкевіча была пададзена і падпісана Марынай Адамовіч, што парушае ч. 2 артыкула 61 ВК (заява павінна быць падпісаная самой асобай, якая вылучаецца кандыдатам).

Паводле ВК колькасць грамадзян у ініцыятыўнай групе павінна быць не менш за 100 чалавек. У ініцыятыўнай групе А. Лукашэнкі 10 577 чалавек. Другая па колькасці група С. Гайдукевіча – 2 481 чалавек. Нормы ВК не патрабуюць пацвярджэння асабістай згоды грамадзяніна на ўключэнне яго ў спісы ініцыятыўнай групы, што дае магчымасці для адвольнага ўключэння людзей у спісы ініцыятыўных груп.

**Вызначэнне месцаў, забароненых для пікетавання з мэтай збору подпісаў**

Рашэнні мясцовых выканаўчых органаў улады па вызначэнні месцаў, забароненых для пікетавання з мэтай збору подпісаў грамадзян, істотна не адрозніваліся ад аналагічных рашэнняў папярэдняй прэзідэнцкай выбарчай кампаніі.

Пагаршэнне ўмоў збору подпісаў адзначалася ў беларускай сталіцы. Рашэннем Мінгарвыканкама № 1842 ад 9 ліпеня 2015 г. да забароненых месцаў аднесены Прывакзальная плошча і плошча Якуба Коласа. У аналагічным рашэнні Мінгарвыканкама 2010 г. гэтых плошчаў у спісе месцаў, забароненых для збору подпісаў, не было. Цяпер таксама нельга збіраць подпісы на плошчы Дзяржаўнага сцяга.

Салігорскі гарвыканкам, акрамя ўжо традыцыйна забароненых месцаў, увёў забарону на збор подпісаў каля помнікаў архітэктуры, гісторыі, культуры і вайсковых пахаванняў. У г. Светлагорску павялічылі адлегласць, на якой забаронена збіраць подпісы. Яна склала 200 метраў ад будынкаў выканкама, міліцыі і пракуратуры. Адначасова ў г. Барысаве адлегласці да будынкаў, у межах якіх нельга збіраць подпісы, скарочаны да 20–50 метраў. Назіральнікі паведамляюць аб павелічэнні колькасці месцаў для збору подпісаў у Бабруйску, Наваполацку, Гродне, Брэсце, Жодзіна.

Рашэнні выканкамаў істотна не абмежавалі магчымасці збору подпісаў ініцыятыўнымі групамі ў публічных месцах, аднак многія забароны мясцовых органаў улады не абумоўлены патрабаваннямі бяспекі і грамадскага парадку. Мясцовыя органы ўлады прадэманстравалі адсутнасць адзінага падыходу да правоў удзельнікаў выбарчага працэсу.

**Збор подпісаў выбаршчыкаў у падтрымку вылучэння кандыдатаў у прэзідэнты**

Для рэгістрацыі кандыдата яго ініцыятыўная група павінна была сабраць не менш за 100 тысяч подпісаў. Збор подпісаў ажыццяўляўся ініцыятыўнымі групамі як шляхам пакватэрнага абыходу выбаршчыкаў, так і падчас вулічных пікетаў у месцах, не забароненых мясцовымі органамі ўлады. Улады не чынілі істотных абмежаванняў пры зборы подпісаў, але

роля выканаўчай вертыкалі ўлады і адміністрацый дзяржаўных прадпрыемстваў у выбарчым працэсе па-ранейшаму заставалася вельмі вялікай.

Актыўна выкарыстоўваўся адміністратыўны рэсурс пры зборы подпісаў за вылучэнне дзеючага кіраўніка дзяржавы. Шмат дзе збор подпісаў у падтрымку А. Лукашэнкі вёўся ў працоўны час, на тэрыторыі прадпрыемстваў і ўстаноў, пры непасрэдным удзеле прадстаўнікоў адміністрацыі. Яго ажыццяўлялі не толькі сябры ініцыятыўнай групы, але і пабочныя асобы. Адзначаліся факты ціску на працаўнікоў.

28 ліпеня на прадпрыемстве «Гомелькабель» ініцыятыўная група А. Лукашэнкі ў працоўны час збірала подпісы. Адміністрацыя загадзя звярнулася да рабочых, каб яны з пашпартамі пайшлі на прахадную. Некаторыя адкрыта выказвалі незадавальненне. Майстры падраздзяленняў пагражалі не працягнуць працоўны кантракт з тымі, хто не падпішацца. Большасць працаўнікоў падпарадкаваліся патрабаванням.

4 жніўня ў філіяле №1 Гомельскай гарадской цэнтральнай паліклінікі ў працоўны час таксама ішоў збор подпісаў. Кіраўніцтва загадала работнікам паліклінікі прысутнічаць з 12.00 да 14.00 з пашпартамі ў актавай зале. У зале знаходзілася жанчына, якая прадставілася сябрам ініцыятыўнай групы А. Лукашэнкі.

Супрацоўнікам СШ №5 г. Крычава, УА «Крычаўскі дзяржаўны прафесійны агратэхнічны каледж», РУПВ «Крычаўскі завод гумавых вырабаў» таксама было загадана прыносіць пашпарты і падпісвацца. Аналагічна дзейнічала адміністрацыя Філіяла ОАО «БЕЛАЗ» «Магілёўскі аўтамабільны завод імя С.М. Кірава», УАЗ «Магілёўскі абласны лячэбна-дыягнастычны цэнтр» і іншыя. Аб падобных фактах адміністрацыйнага ціску на супрацоўнікаў паведамляюць назіральнікі з Маладзечна, Нясвіжа, Баранавічаў. Рэзананс у незалежных СМІ атрымаў «збор подпісаў», арганізаваны адміністрацыяй ААТ «Брэсцкі электрамеханічны завод».

Яшчэ падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі 2010 г. ЦВК дазволіла ўдзельнічаць у запаўненні падпісных лістоў т.зв. «памочнікам сябра ініцыятыўнай групы», статус якіх не прадугледжаны дзеючым ВК.

Пастанова Цэнтральнай камісіі № 18 ад 1 ліпеня 2015 г. дала магчымасць унясення звестак аб выбаршчыку, прадугледжаных графамі 1-5 падпіснога ліста (ўстановачныя дадзеныя грамадзяніна), пры наяўнасці просьбы выбаршчыка, і іншым асобам, у тым ліку не членам ініцыятыўных груп. Дадзенае палажэнне Пастановы супярэчыць артыкулу 61 ВК, які не толькі не прадугледжвае магчымасць запаўнення падпіснога ліста кімсьці акрамя члена ініцыятыўнай групы, але і непасрэдна паказвае, што ў выпадку, калі подпісы выбаршчыкаў былі сабраныя не сябрам ініцыятыўнай групы, альбо падпісны ліст не быў завераны членам ініцыятыўнай групы ці іншым сябрам ініцыятыўнай групы, які не збіраў подпісы, усе подпісы ў падпісным лісце прызнаюцца несапраўднымі (п.8 ч. 16. арт. 61 ВК).

Такое вольнае тлумачэнне парадку збору подпісаў выбаршчыкаў на практыцы стварыла падставы да масавага выкарыстання адміністрацыйнага рэсурса на карысць дзеючага прэзідэнта.

Напрыклад, 5 жніўня 2015 г. ў г. Брэсце на пікеце подпісы збірала неўпаўнаважаная асоба – «памочнік сябра ініцыятыўнай групы» А. Лукашэнкі М. Марозава, якая ў прысутнасці назіральніка атрымала подпіс грамадзянкі Л. Кароціч. Назіральнік адзначыў, што сябры названай ініцыятыўнай групы карыстаюцца выдадзенай вялікім накладам без выходных дадзеных кніжкай «Памятка памочніку сябра ініцыятыўнай групы». Па словах сябра

ініцыятыўнай групы А. Лукашэнкі Ганны Пішчык, гэтую кніжку яна атрымала ад кіраўніка аддзела ідэалогіі Маскоўскага раёна г. Брэста.

Большасць паведамленняў грамадзян аб прымусе падчас збору подпісаў за вылучэнне А. Лукашэнкі і іншых парушэннях ананімныя. Гэта сведчыць аб высокім узроўні страху ў грамадстве і нізкім узроўні даверу грамадзян да дзяржаўных органаў, закліканых абараняць іх законныя правы і інтарэсы. Пры гэтым у інфармацыйных паведамленнях, якія распаўсюджваюцца дзяржаўнымі СМІ ад імя старшыні ЦВК, падкрэсліваецца адсутнасць скаргаў на выбарчы працэс.

Дзяржаўныя СМІ публікавалі шмат матэрыялаў на карысць дзеючага прэзідэнта. Напрыклад, газеты Брэсцкай вобласці на першых старонках далі вялікі артыкул пад назвай «Прэзідэнт прагназуе паляпшэнне сітуацыі ў 2016 годзе» пра рабочую паездку прэзідэнта. Рэгулярна асвятлялася выбарчая актыўнасць ініцыятыўных груп А. Лукашэнкі. Раённыя газеты пераважна передрукоўвалі інфармацыйныя матэрыялы БЕЛТА пра ход выбарчай кампаніі, выказванні кіраўніцтва ЦВК.

**Праверка сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў**

ТВК неахвотна ішлі на кантакт з назіральнікамі. Практычна паўсюль ім не дазвалялі прысутнічаць пры прыёме і праверцы падпісных лістоў. Пра гэта паведамілі назіральнікі з Жодзінскай гарадской ТВК, Смаргонскай раённай ТВК, Баранавіцкай раённай ТВК, Глускай раённай ТВК, Бярозаўскай раённай ТВК, з раённых ТВК Магілёва, Брэста, Гомеля, Віцебска. Некаторыя з іх, напрыклад, Рэчыцкая і Светлагорская ТВК, усё ж дапускалі назіральнікаў да працэдуры праверкі, аднак большасць камісій рабілі праверку закрыта.

Назіральнік кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» прысутнічаў на пасяджэнні Магілёўскай абласной ТВК, якое адбылося 2 верасня. Ён паведаміў, што пасля заканчэння «абвесткі дня» – агалошвання вынікаў праверкі подпісаў, камісія выдаліла журналістаў і назіральнікаў і працягнула сваю працу ў закрытым рэжыме.

У камісіях нядопуск назіральнікаў тлумачылі тым, што праверка подпісаў – «рабочы працэс», а назіральнікі маюць права прысутнічаць толькі на пасяджэннях ВК. Такім чынам, уся рэальная дзейнасць камісій заставалася фактычна непразрыстай.

22 жніўня на пасяджэнні Маладзечненскай раённай камісіі назіральнікі Эдвард Баланчук і Алесь Капуцкі заўважылі парушэнні ў тых падпісных лістах за Мікалая Улаховіча і Сяргея Гайдукевіча, якія не правяраліся камісіяй. У гэтых лістах былі, напрыклад, подпісы грамадзянаў з іншых раёнаў, подпісы асобаў з відам на жыхарства, даты падпісання ў некаторых лістах былі прастаўлены адной рукой. Графічнае падабенства подпісаў выбаршчыкаў выклікала сумненне ў іх сапраўднасці. Азнаёміцца з падпіснымі лістамі, адабранымі да праверкі камісіяй, назіральнікам не далі. Яны накіравалі заяву пракурору Маладзечненскага раёна на парушэнне выбарчага заканадаўства ў частцы афармлення падпісных лістоў па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты. У адказе за подпісам пракурора У. Дубоўскага ад 31.08.2015 № 186ж-15 назіральнікам паведамляецца, што па пытанні праверкі подпісаў яны маюць права звярнуцца ў Мінскую абласную камісію. Такім чынам, пракуратура Маладзечненскага раёна ўхілілася ад пракурорскага нагляду.

Пасля апублікавання ЦВК вынікаў праверкі падпісных лістоў стала вядома, што колькасць сапраўдных подпісаў у падтрымку Аляксандра Лукашэнкі склала 1 753 380 (здадзена 1 761 145), за Мікалая Улаховіча – 149 819 (здадзена 159 805), за Сяргея Гайдукевіча – 139 877 (здадзена 141 842), за Таццяну Караткевіч – 105 278 (здадзена 107 299). Ініцыятыўныя групы

Віктара Цярэшчанкі здалі для праверкі 130 404 подпісы, аднак сапраўднымі з іх прызнаныя толькі 6 699.

Правілы праверкі подпісаў вызначае арт. 67 ВК. Праверку сапраўднасці подпісаў выбаршчыкаў ажыццяўляюць ТВК. Павінна быць праверана не менш за 20% подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах ад колькасці подпісаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдата ў прэзідэнты. Калі ў падпісным лісце ёсць подпісы выбаршчыкаў, якія не пражываюць на тэрыторыі пэўнай выбарчай акругі, гэтыя подпісы не правяраюцца і не ўлічваюцца. Калі колькасць выяўленых пры праверцы несапраўдных подпісаў выбаршчыкаў складзе больш за 15% ад колькасці правераных подпісаў, робіцца дадатковая праверка яшчэ 15% подпісаў выбаршчыкаў ад колькасці подпісаў, неабходных для рэгістрацыі кандыдата.

У выпадку, калі сумарная колькасць несапраўдных подпісаў выбаршчыкаў, выяўленых пры праверках, складзе больш за 15% ад агульнай колькасці правераных подпісаў у падпісных лістах, далейшая праверка подпісаў у падпісных лістах спыняецца.

Такая працэдура праверкі подпісаў патрабуе дакладнага забеспячэння прынцыпу выпадковасці адбору подпісаў на праверку. У адваротным выпадку ўзнікае магчымасць маніпуляваць адборам для неправамоцнай адмовы ў рэгістрацыі кандыдата, альбо наадварот – для неправамоцнай рэгістрацыі кандыдата. Таму прынцыпова важнай з'яўляецца празрыстасць выбаркі подпісаў і іх праверкі, магчымасць назіральнікаў, прэтэндэнтаў у кандыдаты, прадстаўнікоў ініцыятыўных груп кантраляваць гэтыя працэдуры.

Таксама важна адзначыць, што прызнанне несапраўднымі больш за 15% ад ліку адабраных подпісаў пазбаўляе прэтэндэнта права балатавацца, а грамадзян, якія вылучылі гэтага прэтэндэнта сваімі дакладнымі подпісамі, пазбаўляе права мець свайго кандыдата, нават калі колькасць сапраўдных подпісаў перавышае 100 тысяч.

**Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь**

10 верасня 2015 г. адбылося пасяджэнне ЦВК па рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Па пытанні аб выніках збору подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатамі ў прэзідэнты дакладвалі старшыні абласных (Мінскай гарадской) выбарчых камісій. Яны агучылі дадзеныя аб колькасці здадзеных подпісаў, праверцы іх сапраўднасці, колькасці ўстаноўленых сапраўдных подпісаў. Усе дакладчыкі адзначылі сур'ёзныя недахопы ў падпісных лістах у падтрымку У. Цярэшчанкі.

Па просьбе Л. Ярмошынай і ў сувязі з заявай партыі БНФ аб парушэннях ініцыятыўнай групай А. Лукашэнкі заканадаўства пры зборы подпісаў, старшыні выбарчых камісій падрабязна дакладалі аб разглядзе паведамленняў пра факты парушэнняў заканадаўства гэтай ініцыятыўнай групай. Паводле іх словаў, у выніку праведзеных праверак усе звесткі, указаныя ў заяве БНФ, не пацвердзіліся. Было адзначана, што большасць паведамленняў аб парушэнні парадку збору подпісаў з'яўляюцца ананімнымі, а некаторыя скаргі прызнаныя неабгрунтаванымі.

ЦВК разгледзеў заявы Ж. Раманоўскай і В. Цярэшчанкі і прыняў пастанову аб адмове ў рэгістрацыі гэтых асобаў.

Па выніках збору подпісаў і на падставе вывучэння дакументаў, пададзеных патэнцыйнымі кандыдатамі С. Гайдукевічам, Т. Караткевіч, М. Улаховічам, А. Лукашэнкам, ЦВК прыйшоў да высновы, што названыя асобы адпавядаюць усім патрабаванням, і зарэгістраваў іх у якасці кандыдатаў. Праверка ЦВК паказала, што ў дэкларацыі аб даходах і маёмасці С. Гайдукевіча і яго жонкі ёсць недакладнасці ў частцы неўключэння некаторых сум у даходы. Аднак

паколькі яны не перавышаюць 20% ад агульнай сумы гадавога даходу, ЦВК вырашыў зарэгістраваць С. Гайдукевіча кандыдатам.

Пры разглядзе пытання аб рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты А. Лукашэнкі таксама вывучаўся зварот партыі БНФ аб парушэннях ініцыятыўнай групай А. Лукашэнкі заканадаўства пры зборы подпісаў. У звароце БНФ указваліся факты выкарыстання адміністрацыйнага рэсурса, парушэнне парадку фінансавання выбарчай кампаніі (друк партрэтаў Лукашэнкі не са сродкаў выбарчага фонду).

Дакладчык па гэтым пытанні Л. Ярмошына адзначыла, што нават калі б факты парушэнняў заканадаўства гэтай ініцыятыўнай групай пацвердзіліся, падстаў для адмовы А. Лукашэнкі кандыдатам у прэзідэнты няма, бо да гэтага яго ініцыятыўнай групе не выносіліся папярэджанні. Акрамя таго, яна ўказала на тое, што большасць зваротаў аб парушэнні заканадаўства ініцыятыўнай групай Лукашэнкі з'яўляюцца ананімнымі, што робіць немагчымым іх разгляд. Па словах кіраўніка іныцыятыўнай групы М. Орды, выраб партрэтаў кандыдата ажыццяўляўся за кошт грамадскіх сродкаў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, партрэты не з'яўляліся ні інфармацыйнымі буклетамі, ні агітацыйнымі матэрыяламі. Гэты адказ задаволіў ЦВК.

## ПЕРАДВЫБАРЧАЯ АГІТАЦЫЯ

Парадак вядзення агітацыі за кандыдатаў у Прэзідэнты ўсталяваны ВК і пастановамі ЦВК. Забараняецца агітацыя, пры правядзенні якой прапагандуецца вайна, гучаць заклікі да гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу і іншае. Таксама забаронена агітацыя, якая ўтрымлівае заклікі да зрыву, або адмены, або пераносу тэрміну выбараў, прызначаных у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Заклікі да байкоту выбараў ЦВК і праваахоўныя органы расцэньваюць як заклікі да зрыву выбараў і кваліфікуюць іх як парушэнне заканадаўства.

Пастановай ЦВК ад 6 жніўня 2015 г. № 49 зацверджана «Палажэнне аб парадку выкарыстання сродкаў масавай інфармацыі пры падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2015 годзе». У адпаведнасці з ім, кандыдат у Прэзідэнты мае права на два бясплатныя выступы ў эфіры тэлеканала «Беларусь-1» і два бясплатныя выступы працягласцю не больш за 30 хвілін у эфіры Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё. Дата і час выхаду ў эфір тэле- і радыёперадач з перадвыбарчымі выступамі кожнага кандыдата вызначаецца лёсаваннем, якое робіць ЦВК. Тэлерадыёперадачы з перадвыбарчымі выступамі кандыдатаў, тэледэбаты ідуць у прамым эфіры, аднак могуць трансляваццa і ў запісе.

Сёлетняя выбарчая кампанія праводзілася па новых правілах фінансавання выдаткаў на правядзенне агітацыі (раней па іх былі праведзены мясцовыя выбары 2014 г.). У адпаведнасці з ВК у рэдакцыі 25.11.2013, усе выдаткі на выраб друкаванай агітацыйнай прадукцыі аплочваюцца выключна са сродкаў выбарчых фондаў, якія ствараюцца кандыдатамі ў прэзідэнты. Са сродкаў дзяржаўнага бюджэту ЦВК вырабляе і распаўсюджвае толькі агульныя інфармацыйныя матэрыялы пра ўсіх кандыдатаў у прэзідэнты.

Новае Палажэнне «Аб выбарчым фондзе асобы, якая вылучаецца кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, кандыдата ў Прэдзідэнты Рэспублікі Беларусь пры правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2015 годзе» вызначае, што максімальны памер выдаткаў са сродкаў выбарчага фонду кандыдата ў прэзідэнты не можа перавышаць 9000 базавых

велічынь. Фонд можа складацца з унёскаў самога кандыдата ў прэзідэнты, а таксама фізічных асоб – да 20 БВ ад кожнай, юрыдычных асоб – да 50 БВ.

Палажэнне не прадугледжвае магчымасці грамадскага кантролю крыніц паступлення сродкаў у выбарчы фонд. Законнасць фарміравання фонду і выдаткавання сродкаў з яго ацэньваюць толькі фінансавая органы і ЦВК.

**Агітацыя шляхам сустрэч з выбаршчыкамі**

Прынятыя мясцовымі распарадчымі органамі ўлады рашэнні аб вызначэнні месцаў для правядзення агітацыйных масавых мерапрыемстваў (сходаў па-за памяшканнямі, мітынгаў, пікетаў) прадэманстравалі непаслядоўнасць мясцовых уладаў ў гэтым пытанні. У многіх гарадах краіны, у тым ліку ў сталіцы, былі прынятыя даволі ліберальныя рашэнні.

Увогуле рашэнне Мінгарвыканкама не абмяжоўвае правоў кандыдатаў. Спрыяльныя ўмовы для передвыбарнай агітацыі стварыў Быхаўскі райвыканкам: прадастаўляюцца памяшканні Цэнтра культуры, народнай творчасці і рамёстваў, Быхаўскага раённага цэнтра дзіцячай творчасці, актавыя залы арганізацый і іншае.

У той жа час многія назіральнікі ў рэгіёнах паведамлялі, што мясцовыя органы ўлады вызначылі для агітацыйных масавых мерапрыемстваў месцы маланаведваемыя ці аддаленыя ад цэнтра населенага пункта.

У Ленінскім раёне г. Гродна з васьмі такіх месцаў толькі адно можа лічыцца людным і прыдатным для агітацыі. Не лепшая сітуацыя і ў Кастрычніцкім раёне горада: усе 11 месцаў малалюдныя (спартовыя пляцоўкі каля школ і гімназій, сквер па вул. Левабярэжная). У Ленінскім і Кастрычніцкім раёнах г. Магілёва месцы для агітацыі па-ранейшаму не адпавядаюць свайму прызначэнню, а цэнтр горада фактычна выпадае з агітацыі. Усяго адно месца на тэрыторыі раёна для перадвыбарчых масавых мерапрыемстваў вызначыў Хоцімскі райвыканкам.

Прыкметнай была агітацыйная дзейнасць Т. Караткевіч. Практычна незаўважнымі засталіся агітацыйныя мерапрыемствы кандыдатаў С. Гайдукевіча і М. Улаховіча. Дзейсны прэзідэнт публічна адмовіўся ад удзелу ў агітацыйнай кампаніі, аднак яго каманда прымала актыўныя агітацыйныя захады.

Шырока арганізоўваліся мерапрыемствы з удзелам давераных асоб А. Лукашэнкі: сустрэчы ў працоўных калектывах, наведванне прадпрыемстваў, навучальных установ і г.д. У гэтых сустрэчах заўсёды бралі ўдзел кіраўнікі мясцовых і цэнтральных органаў улады, прадпрыемстваў і ўстаноў. Асноўнай мэтай такіх мерапрыемстваў быў заклік выбаршчыкаў падтрымаць існуючы ў краіне палітычны курс і ўзяць удзел у выбарах.

24 верасня ў Віцебску на сустрэчы Міністра сельскай гаспадаркі Леаніда Зайца з прафесарска-выкладчыцкім складам і студэнтамі Акадэміі ветэрынарнай медыцыны гаварылася пра перспектывы развіцця аграпрамысловага комплекса краіны, неабходнасць падтрымкі на выбарах улады і эканамічнага курса краіны. Рэктар Антон Ятусевіч даклаў, што ў 2010 г. у

падначаленай яму навучальнай установе 96 % галасоў было аддадзена за Лукашэнку, і пераканаў міністра ў далейшай падтрымцы.

25 верасня ў Гомелі адбылася сустрэча з даверанай асобай А. Лукашэнкі Сяргеем Бяспалым, галоўным рэдактарам газеты «Гомельская праўда». Аўдыторыю выбаршчыкаў забяспечылі знятыя на гэты час з заняткаў студэнты і выкладчыкі ГДУ імя Ф. Скарыны.

**Выбарчыя фонды**

Паводле дадзеных ЦВК за 7 кастрычніка, у выбарчы фонд С. Гайдукевіча паступіла больш за 42 млн руб, у фонд Т. Караткевіч – больш за 26 млн, у фонд М. Улаховіча – больш за 33 млн., у фонд А. Лукашэнкі – больш за 1,5 млрд рублёў. Кандыдат С. Гайдукевіч выкарыстаў практычна ўсе сродкі, Т. Караткевіч, М. Улаховіч – больш за палову. На 7 кастрычніка сума, выкарыстаная кожным кандыдатам, складае каля 7% ад той сумы, якую афіцыйна выдаткаваў на сваю кампанію А. Лукашэнка.

«Еўрарадыё» зрабіла журналісцкае расследаванне фактаў рассылкі агітацыйных матэрыялаў (паштовак) пад назвай «За будучыню незалежнай Беларусі!» у падтрымку А. Лукашэнкі. Наклад паштовак склаў 2,5 млн штук. Еўрарадыё падлічыла, што кошт вырабу і рассылкі такой колькасці паштовак значна перавышае суму выдаткаў выбарчага фонду А. Лукашэнкі. Таксама трэба адзначыць, што агітацыйныя паштоўкі за кандыдата А. Лукашэнку, якія былі данесены практычна да кожнай кватэры, не змяшчаюць выходных дадзеных, што не адпавядае патрабаванням ч. 9 артыкула 45 ВК Рэспублікі Беларусь.

Журналісты і назіральнікі не мелі магчымасці атрымаць інфармацыю пра крыніцы напаўнення і выдаткаванне выбарчых фондаў.

**Агітацыя ў СМІ**

Ацэнка агітацыйнай кампаніі ў беларускіх медыа зроблена ў справаздачах БАЖ. Адзначаецца, што нягледзячы на з'яўленне станоўчых элементаў, такіх як пазітыўная ці нейтральная прэзентацыя (а не толькі негатыўная, як раней) кандыдатаў-率пернікаў дзеючага Прэзідэнта, нельга сцвярджаць, што ў мадэлі асвятлення сёлетняй выбарчай кампаніі дзяржаўнымі медыа адбыліся істотныя змены. Яна па-ранейшаму арыентаваная на прамоцыю толькі аднаго прэтэндэнта на вышэйшую пасаду. БАЖ прааналізавала эфірны час дзяржаўных тэлеканалаў і інфармацыю друкаваных і электронных выданняў, звязаную з выбарамі. Напрыклад, у праграме «Наши новости» (ОНТ) 65 % эфірнага часу было прысвечана А. Лукашэнку, 4% – Т. Караткевіч, 3 % – С. Гайдукевічу і столькі ж – М. Улаховічу. У праграме «Панарама» (БТ) 58% эфірнага часу было прысвечана Лукашэнку, а іншым кандыдатам – прыблізна па 4%.

У недзяржаўных СМІ – іншая тэндэнцыя. У інтэрнэт-выданні naviny.by найбольш плошчы атрымалі кандыдаты Улаховіч (24%) і Караткевіч (16%), а Лукашэнка і Гайдукевіч – толькі па 6%. Між тым тыднёвік «Наша Ніва» больш за другіх пісаў пра Лукашэнку (52%) і Караткевіч (25%), характарызуючы іх як нейтральна, так і адмоўна.

Дзяржаўныя СМІ шырока асвятляюць акцыі недзяржаўных праўладных арганізацый, якія заявілі пра сваю падтрымку прэзідэнта. Раённыя газеты на першых старонках апублікавалі заяву ФПБ ад 25 верасня. «Мы призываем всех граждан нашей страны, − гаворыцца ў заяве, − объединиться и поддержать на выборах Александра Григорьевича Лукашенко <…> Под руководством Александра Лукашенко Беларусь прошла колоссальный путь развития и состоялась как независимое государство. Именно благодаря Президенту в нашей стране сохранен мир и порядок. Глава государства всегда на стороне простых людей. Он переживает

и болеет за страну, ответственен за судьбу Отечества. Это вызывает искреннее уважение белорусского народа».

**Выкарыстанне ў агітацыі адміністрацыйнага рэсурсу**

Фактычна на агітацыю ў падтрымку дзейснага прэзідэнта мабілізаваліся праўрадавыя грамадскія арганізацыі. ГА «БРСМ» ладзілі акцыі «Наш год – наш выбар!», вялі інтэрнэт-праект «Мая Беларусь – мой выбар», удзельнікам якога прапаноўвалася публікаваць ў сацыяльных сетках розную інфармацыю пра Беларусь і будучыя выбары, суправаджаючы яе хэштэгамі нейтральнага (#маябеларусь, #япатриот, #выборы2015) і відавочна агітацыйнага зместу (#забатьку). Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі правола серыю канцэртаў з выкарыстаннем сімволікі агітацыйнай кампаніі дзеючага прэзідэнта пад дэвізам «Мы – разам!» (афіцыйная назва – «рэспубліканская народна-патрыятычная акцыя»). Важна адзначыць, што падобныя мерапрыемствы не фінансаваліся за кошт сродкаў выбарчага фонду кандыдата ў прэзідэнты, а гэтыя арганізацыі атрымліваюць дзяржаўнае фінансаванне і падтрымку.

## ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ

Датэрміновае галасаванне праводзілася з 6 па 10 кастрычніка з 10.00 да 16.00 і з 16.00 да 19.00. Згодна з арт. 53 ВК выбаршчык, які не можа прагаласаваць у дзень выбараў, мае права не раней чым за пяць дзён да выбараў прагаласаваць у памяшканні для галасавання. Афіцыйнага пацверджання прычын немагчымасці выбаршчыка прагаласаваць у дзень выбараў не патрабуецца.

Такім чынам, закон прадугледжвае датэрміновае галасаванне ў якасці выключэння, а не правіла: прагаласаваць датэрмінова могуць толькі тыя грамадзяне, якія не маюць магчымасці ў дзень выбараў знаходзіцца па месцы свайго жыхарства. Аднак у краіне даўно склалася незаконная практыка, калі датэрміновае галасаванне пераўтварылася ў норму.

Датэрміновае галасаванне на сёлетніх прэзідэнцкіх выбарах не стала выключэннем з пяпярэдняй практыкі. Паводле дадзеных ЦВК, за пяць дзён у датэрміновым галасаванні ўзялі ўдзел 36,05 % выбаршчыкаў, што з’яўляецца найвялікшай колькасцю з улікам папярэдніх прэзідэнцкіх выбараў 2001, 2006, 2010 гг. Улічваючы, што яўка па выбарах склала 86,75%, у датэрміновым галасаванні прыняло ўдзел 41,5 % выбаршчыкаў ад колькасці ўсіх, хто галасаваў.

Назіральнікамі кампаніі былі зафіксаваныя асобныя факты завышэння яўкі на некаторых выбарчых участках (6,2 % са 114 УВК) на якіх вялося назіранне (у 2010 г. – 2,8 %). На некаторых УВК такая розніца дасягала 50%. У шэрагу выпадкаў назіральнікамі былі зафіксаваныя факты маніпуляцый з пратаколамі УВК аб выніках датэрміновага галасавання. Пры гэтым завышэнне яўкі не насіла значнага і сістэмнага характару.

Напрыклад, у Баранавічах на выбарчым участку №20 за 5 дзён датэрміновага галасавання, па дадзеных участковай камісіі, прагаласавала 855 чалавек, а па падліках назіральнікаў – 593. Такім чынам, розніца склала 262 чалавекі. Пры гэтым у апошні дзень датэрміновага галасавання, 10 кастрычніка, назіральнікі пазначылі, што прагаласавала 206 чалавек, а па падліку камісіі, наадварот, – толькі 162. Падаецца, што заніжэнне яўкі ў апошні дзень зроблена дзеля таго, каб дадзеныя аб колькасці бюлетэняў у скрыні адпавядалі выніковай лічбе ў пратаколе.

Адзначаны шматлікія выпадкі прымусу выбаршчыкаў да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні з боку адміністрацый дзяржаўных прадпрыемстваў, ВНУ, інтэрнатаў. Жыхары інтэрнату №10 г. Бабруйска паведамілі, што ім пагражалі высяленнем, калі яны не прагаласуюць датэрмінова. Падчас датэрміновага галасавання на выбарчым участку №27 г. Бабруйска, які

знаходзіцца ў будынку Бабруйскага дзяржаунага аўтатранспартнага каледжу, сябра камісіі Наталля Кароль, якая працуе настаўнікам у гэтай навучальнай установе, дала наказ старасце адной з груп, каб навучэнцы хутчэй ішлі галасаваць і забяспечылі высокую яўку.

Кіраўніцтва ААТ «Белшына» загадала працоўным прагаласаваць датэрмінова і паведаміць нумар свайго выбарчага ўчастку, каб пракантраляваць праз сябраў камісій. Адміністрацыя ААТ «Беларуськалій» правяла сустрэчу з інжынерна-тэхнічным персаналам, пад час якой кіраўнік першага рудаўпраўлення Аляксандр Гарбачоў патрабаваў забяспечыць яўку на выбары і прагаласаваць датэрмінова, «калі нехта не ўпэўнены, што ў яго гэта атрымаецца ў дзень выбараў». Варта адзначыць, што ў той жа час Гарбачоў узначальвае адну з участковых выбарчых камісій у Салігорску. Відэа сустрэчы было перададзенае назіральнкам кампаніі “Праваабаронцы за свабодныя выбары” і выстаўлена на сайце кампаніі. Па гэтым факце ў пракуратуру Салігорскага р-на юрыстамі кампаніі быў пададзены зварот, па выніках разгляду якога пракурорам Салігорскага р-на ў мэтах недапушчэння парушэнняў канстытуцыйных свабодаў супрацоўнікаў ААТ “Беларуськалій” была праведзена прафілактычная гутарка з А. Гарбачовым.

Гэта паўтарыла негатыўную практыку папярэдніх выбарчых кампаній.

## ГАЛАСАВАННЕ ПА МЕСЦЫ ЗНАХОДЖАННЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ

Забеспячэнне галасавання па месцы знаходжання ў дзень выбараў адпаведна ВК адбываецца выключна па пісьмовай ці вуснай просьбе выбаршчыка, які не можа з’явіцца на ўчастак. Тлумачэнне прычын не патрабуецца. УВК стварае спецыяльны ўкладны спіс такіх выбаршчыкаў і атрымлівае выбарчыя бюлетэні. Колькасць выбарчых бюлетэняў павінна адпавядаць колькасці выбаршчыкаў ва ўкладным лісце. У асноўным спісе насупраць прозвішчаў выбаршчыкаў робіцца запіс «прагаласаваў па месцы знаходжання». Спецыяльную скрыню для галасавання суправаджаюць не менш за два сябры УВК, якія загадзя атрымоўваюць колькасць бюлетэняў, адпаведную колькасці выбаршчыкаў, унесеных у спецыяльны спіс. Для арганізацыі галасавання па месцы знаходжання на УВК павінна быць не больш за тры пераносныя скрыні.

Гэты від галасавання традыцыйна крытыкуюць незалежныя назіральнікі, бо існуючыя працэдуры робяць магчымымі рознага кшталту маніпуляцыі. Назіральнікі не могуць праверыць, ці сапраўды паступалі заяўкі выбаршчыкаў аб арганізацыі галасавання па месцы знаходжання, паколькі заканадаўства прадугледжвае магчымасць не толькі пісьмовых, але і вусных зваротаў. Не заўсёды назіральнікі мелі магчымасць сачыць за такім відам галасавання яшчэ і таму, што сябры УВК адмаўлялі ім у гэтым.

Падчас назірання фіксаваліся выпадкі, калі выбаршчыкі не звярталіся з просьбай аб арганізацыі такога галасавання і паведамлялі гэта сябрам УВК, калі тыя прыйшлі да іх са скрыняй. Адзначаны выпадкі, калі назіральнікам не давалі інфармацыі аб колькасці выбаршчыкаў, унесеных у спіс для галасавання па месцы знаходжання. Часам колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі па месцы свайго знаходжання, не супадала з колькасцю скарыстаных для гэтага галасавання бюлетэняў.

## ГАЛАСАВАННЕ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ І ПАДЛІК ГАЛАСОЎ

Працэс галасавання на выбарчых участках традыцыйна быў арганізаваны на дастаткова высокім тэхнічным узроўні і, агульна кажучы, праходзіў адпаведна ўстаноўленым выбарчым працэдурам. Пры гэтым важна адзначыць, што закрытасць для назіральнікаў спісу выбаршчыкаў робіць немагчымым грамадскі кантроль за выдачай бюлетэняў і ўзроўнем яўкі выбаршчыкаў.
Асноўным прынцыпам правядзення падліку бюллетэняў з’яўляецца іх асобны падлік: спачатку лічаць бюлетэні са скрыняў для датэрміновага галасавання, потым – са скрыняў для галасавання па месцы знаходжання выбаршчыкаў, а потым – са скрыняў для датэрміновага

галасавання. Вынікі такога падліку толькі агучваюцца УВК і, згодна з палажэннямі, зафіксаванымі ў Дапаможніку для сяброў УВК па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (зацверджы пастановай ЦВК № 11 ад 14.05.2015), указваюцца ў пратаколе пасяджэння УВК. Пратакол складаецца ў адным асобніку і не з'яўляецца даступным для назіральнікаў. У пратаколе аб выніках назірання ўказваецца толькі сумарны вынік галасавання. Выраблены назіральнікам копія пратакола аб выніках галасавання сябрамі камісіі не падпісваецца, пячаткай камісіі не замацоўваецца.

Варта адзначыць, што непасрэдна сам метад падліку бюллетэняў УВК у заканадаўстве не прапісаны, што з'яўляецца адной з асноўных праблем беларускага выбарчага заканадаўства. БХК звярнуўся ў ЦВК з прапановай усталяваць дакладную працэдуру падліку галасоў, пры якой адзнака на кожным бюлетэні абвяшчалася б услых з дэманстрацыяй бюлетэня ўсім прысутным сябрам УВК і назіральнікам. Аднак ЦВК адмовіў у рэалізацыі гэтай прапановы.

Вынікі апрацоўкі справаздач з 326 выбарчых участкаў, ахопленых назіраннем кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», даюцца ў табліцы 1.

| **ПЫТАННЕ** | **% ТАК** | **% НЕ** |
|---|---|---|
| 1. Ці ўсе зарэгістраваныя назіральнікі былі дапушчаныя да назірання за падлікам галасоў? | 94,9 | 5,1 |
| 2. Ці маглі вы бачыць змест бюлетэняў? | 23,1 | 76,9 |
| 3. Ці выдаляліся назіральнікі падчас падліку галасоў? | 1,3 | 98,7 |
| 4. Ці ажыццяўляўся асобны падлік бюлетэняў з розных скрыняў (для датэрміновага галасавання, для галасавання на ўчастку і па месцы знаходжання выбаршчыкаў)? | 91 | 9 |
| 5. Ці агалошваліся вынікі асобнага падліку бюлетэняў з розных скрыняў? | 60,3 | 39,7 |
| 6. Ці падавалі вы скаргі на дзеянні камісіі? | 20,5 | 70,5 |
| 7. Ці разглядаліся на пасяджэнні УВК тыя скаргі, што паступілі? | 12,2 | 87,8 |
| 8. Ці маглі вы і іншыя назіральнікі знаходзіца ў зручным для назірання месцы? | 48,1 | 51,9 |
| 9. Ці быў вывешаны выніковы пратакол з вынікамі галасавання для ўсеагульнага азнаямлення? | 96,8 | 3,2 |
| 10. Ці даступны выбарчы ўчастак для людзей з паніжанай мабільнасцю (пандусы, паніжаныя парогі і г.д.)? | 39,9 | 60,1 |

| | | |
|---|---|---|
| 11.Калі не, ці забяспечана камісія людзьмі, якія змогуць дапамагчы зайсці чалавеку з інваліднасцю? | 67,4 | 32,6 |




Па-ранейшаму застаецца закрытай для назіральнікаў працэдура перадачы выніковых пратаколаў з УВК у ТВК. Пры гэтым у некалькіх выпадках назріальнікі і журналсіты адзначалі неадпаведнасць дадзеных з пратаколаў з агульнымі дадзенымі па тэрыторыі. Напрыклад, па дадзеным ЦВК, за кандыдата ў прэзідэнты Т. Караткевіч прагаласавала 887 чалавек ва ўсіх УВК Смаргонскага раёна. Між тым толькі на адным з участкаў – УВК №8 Смаргонскага раёна, – згодна з афіцыйнымі пратаколамі, за Караткевіч прагаласавала 1870 выбаршчыкаў – на 111% больш, чым агульная лічба па раёну. ЦВК адмовілася даць інфармацыю аб выніках галасавання па кожнай УВК раёна.

Аналагічная сітуацыя склалася ў Акцябрскім раёне (Гомельская вобласць). ЦВК змясціла інфармацыю на афіцыйным сайце, што ўсяго ў раёне, дзе налічваецца 21 выбарчы ўчастак, за Т. Караткевіч прагаласавала 94 выбаршчыкі, а супраць усіх – 39. У той жа час, па афіцыйных пратаколах аднаго толькі ўчастка №2, за Т. Караткевіч было пададзена 226 галасоў, а супраць усіх – 63. Раённая пракуратура адмовілася разглядаць па сутнасці скаргу назіральнікаў па гэтым факце, таму што быў прапушчаны дзесяцідзённы тэрмін падачы скаргаў.

Тое ж самае адбылося і ў г. Рагачове. Толькі на сямі ўчастках, згодна з афіцыйнымі пратаколамі, назіральнікі зафіксавалі 1484 галасоў за Т. Караткевіч. Выніковая лічба ЦВК па ўсім горадзе – 916 галасоў. У Жлобіне на васьмі ўчастках, дзе прысутнічалі незалежныя

назіральнікі, за Т. Караткевіч прагаласавала 1879 выбаршчыкаў, што склала 70% усіх галасоў за гэтага кандыдата на 70-ці ўчастках горада (усяго, па дадзеных ЦВК, 2596).

## СКАРГІ І ЗВАРОТЫ, ЗВЯЗАНЫЯ З ВЫБАРАМІ

За час правядзення передвыбарчай кампаніі і саміх выбараў назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» падрыхтавалі вялікую колькасць скаргаў і зваротаў адносна рознага роду парушэнняў. Прыведзеныя ў гэтым раздзеле скаргі і звароты адлюстроўваюць найбольш праблемныя пытанні мінулых выбараў. Варта адзначыць, што ў пераважнай большасці выпадкаў заяўнікам было адмоўлена ў задавальненні іх патрабаванняў.

### Фарміраванне выбарчых камісій

У пракуратуру Смаргонскага раёна была пададзена скарга аб незаконным уключэнні ў УВК №6 двух членаў, за вылучэнне якіх падпісаліся адны і тыя ж выбаршчыкі. Пракуратара перанакіравала скаргу ў Смаргонскую ТВК, якая прызнала скаргу абгрунтаванай і перадала ў Смаргонскі райвыканкам, паколькі фарміраванне камісій належыць да яго кампетэнцыі. Смаргонскага райвыканкам задаволіў скаргу і сваім новым рашэннем абодва члена камісіі былі выключаны са складу УВК.

27 жнівень назіральнікі накіравалі вусную скаргу ў ЦВК на Бярозаўскі райвыканкам у сувязі з тым, што ні на сайце райвыканкама, ні на пасяджэнні, якое прайшло 25 жніўня, нельга была даведацца, ці ўключылі вылучаных пяць прадстаўнікоў ад Брэсцкай арганізацыі партыі БНФ і двух прадстаўнікоў ад «Грамады» ў склад УВК. Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына ў электронным адказе прынесла «прабачэнне за непрафесійныя дзеянні мясцовага выканкаму» і паведаміла, што «інфармацыя аб гэтым даведзена да ведама кіраўніцтва Брэсцкага аблвыканкама для прыняцьця неабходных мер рэагавання».

### Перадвыбарчая агітацыя

2 кастрычніка ЦВК разгледзела скаргі кандыдата ў прэзідэнты Т. Караткевіч і яе зварот аб прадастаўленні дадатковага эфірнага часу на дзяржаўным радыё і тэлебачанні.

У сваіх скаргах у ЦВК кандыдат Т. Караткевіч указвала на парушэнні правілаў вядзення агітацыі і прынцыпаў роўнасці ўсіх кандыдатаў, дапушчаных кандыдатам А. Лукашэнкам, і патрабавала вынесці яму папярэджанне ў адпаведнасці з палажэннямі ВК. У прыватнасці, яна паведамляла аб выкарыстанні дзяржаўнымі СМІ, Беларускім тэлеграфным агенцтвам сімвала ў выглядзе «галачкі», умаляванай у арнамент і колеры дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь. Гэты сімвал з’яўляўся ў паведамленнях і рубрыках пра выбары, у анлайн-дадатку для смартфонаў «Выбары – 2015», распрацаваных БРСМ і названым агенцтвам, пры правядзенні серыі канцэртаў «Мы – разам» і ў агітацыйных матэрыялах самога А. Лукашэнкі. Таксама яна ўказвала пра факт продажу ААТ «ЦУМ Мінск» маек вытворчасці ААТ «Світанак» з выявай лозунга кампаніі кандыдата А. Лукашэнкі «За будучыню незалежнай Беларусі!», выраблены не за кошт сродкаў выбарчага фонду кандыдата.

Аналагічная скарга была пададзена і экспертамі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары». У другой скарзе кандыдат Т. Караткевіч указвала на факт правядзення 5-га афіцэрскага сходу і прыняцця яго ўдзельнікамі звароту да афіцэраў і членаў іх сем'яў з заклікам падтрымаць кандыдатуру дзейснага кіраўніка дзяржавы. Зварот быў апублікаваны на сайце Міністэрства абароны 25 верасня. На думку заяўніка, дадзены зварот меў прыкметы агітацыі.

Разгледзеўшы скаргі і зварот кандыдата Т. Караткевіч, ЦВК адмовіла ў іх задавальненні. У сваёй Пастанове № 81 аб выніках разгляду скаргі Т. Караткевіч ЦВК паказала, што

вышэйзгаданы знак у выглядзе «галачкі» быў распрацаваны Беларускім тэлеграфным агенцтвам (БелТА) у 2010 г., выкарыстоўваўся ў перыяды выбараў і з пачаткам выбарчай кампаніі 2015 г. зноў размешчаны на інтэрнэт-сайце агенства. Пасля аналагічныя сімвалы незалежна адзін ад аднаго вырашылі выкарыстаць многія сродкі інфармацыі пры асвятленні выбарчай кампаніі. У сувязі з гэтым, на думку ЦВК, сцвярджэнне, што ўказаны сімвал атаясамліваецца з канкрэтным кандыдатам «не адпавядае рэчаіснасці». Рэалізацыя ж ААТ «ЦУМ Мінск» мужчынскіх маек вытворчасці ААТ «Світанак», на думку ЦВК, з'яўляецца «звычайнай камерцыйнай дзейнасцю вытворчай і гандлёвай арганізацыі, а малюнак на майках – дызайнерскім рашэннем вытворцы».

На думку экспертаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары», рашэнні ЦВК незаконныя і не абгрунтаваныя. Яны не даюць належнай ацэнкі фактам сур’езных парушэнняў выбарчага заканадаўства (арт. 45, 46, 48 ВК) пры правядзенні агітацыі кандыдатам у прэзідэнты А. Лукашэнка. Выкарыстанне пры правядзенні перадвыбарчых мерапрыемстваў шэрагам дзяржаўных, грамадскіх арганізацый і СМІ сімвала, аналагічнага знаку, які выкарыстоўваецца пры агітацыі за А. Лукашэнку, атаясамлівае гэтыя мерапрыемствы з асобай дадзенага кандыдата, падахвочвае выбаршчыка галасаваць менавіта за яго.

Адзенне вытворчасці ААТ «Світанак» з выявай лозунгу «За будучыню незалежнай Беларусі!» таксама ўтрымлівае прыкметы перадвыбарчай агітацыі. У адпаведнасці з дзеючым выбарчым заканадаўствам выраб усёй агітацыйнай прадукцыі павінна ажыццяўляцца за кошт сродкаў, створанага кандыдатамі ў Прэзідэнты выбарчага фонду.

Юрысты кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» падалі скаргу ў ЦВК па факту парушэння заканадаўства аб выбарах даверанай асобай кандыдата А. Лукашэнкі, старшынёй Белтэлерадыёкампаніі Г. Давыдзькам. У парушэнне Арт. 46 ВК ён 11 верасня вёў перадачу «Клуб рэдактараў», у якой асвятлялася і тэма выбараў. 24 верасня старшыня ЦВК адрэагавала на парушэнне і заявіла, што «строга папярэдзіла» Г. Давыдзьку. Які прававы статус такога папярэджання, і чаму яно было вынесена не самому кандыдату А. Лукашэнку, а яго даверанай асобе, пакуль не высветлена. Адказу з ЦВК не паступіла. Варта адзначыць, што дадзенае папярэджанне, не было аформлена адпаведнай пастановай ЦВК і, адпаведна артыкулу 49 ВК, павінна было выносіцца самому кандытату.

**Датэрміновае галасаванне**

8 кастрычніка міжраённаму пракурору г. Баранавічы была накіравана скарга аб грубым парушэнні Выбарчага кодэксу на выбарчым участку № 20 г. Баранавічы падчас датэрміновага галасавання. Назіральнікі кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» зафіксавалі падлог дакументаў падчас галасавання 6 і 7 кастрычніка. Паколькі гэтыя парушэнні маглі паўплываць на вынікі выбараў, заяўнікі папрасілі прыцягнуць парушальнікаў закона да крымінальнай адказнасці і адмяніць вынікі выбараў на гэтым участку. 9 кастрычніка міжраённы пракурор г. Баранавічы накіраваў скаргу старшыні Баранавіцкай гарадской ТВК. 10 кастрычніка старшыня Баранавіцкай ТВК адказаў, што была праведзена праверка, якая не выявіла ніякіх парушэнняў закона, а трое іншых назіральнікаў далі «станоўчую адзнаку» працы камісіі.

11 кастрычніка назіральнікі з г. Магілёва падалі скаргу старшыні УВК №117 на фальсіфікацыю выніковага пратаколу датэрміновага галасавання. Па падліках назіральнікаў, усяго на ўчастку датэрмінова прагаласавала 370 выбаршчыкаў, аднак у пратаколе пазначана значна большая колькасць – 565 чалавек. У скарзе было ўказана, што паміж назіральнікамі і членамі камісіі праводзілася рэгулярная зверка колькасці прагаласаваўшых праз кожных 5-10

чалавек. Па ўсіх пунктах скаргі было адмоўлена, за што аднагалосна прагаласавалі ўсе члены УВК.

**Галасаванне на выбарчых участках і падлік галасоў**

Па фактах заніжэння на асобных ТВК колькасці прагаласаваўшых за Т.Караткевіч (увогуле па ТВК менш чым адной з УВК) назіральнікамі падаваліся запыты аб выніках галасавання па ўсіх участках гэтай ТВК. Аднак паусюль былі атрыманы адмовы.

Напрыклад, назіральнік з Барысава атрымаў на запыт аб выніках выбараў па кожным участку Барысаўскага раёну з райвыканкаму адказ, што «ў адпаведнасці з часткай 11 артыкула 55 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь для адкрытасці і галоснасці копіі пратаколаў участковых камісій пасля іх падпісання вывешваліся для ўсеагульнага азнаямлення ў месцах, устаноўленых камісіямі», таму ўсе зацікаўленыя «маглі азнаёміцца з вынікамі выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь на кожным выбарчым участку».

Такі ж неінфарматыўны адказ атрымаў назіральнік з г. Мазыра на пададзеную 24 кастрычніка скаргу, дзе прасіў прадаставіць магчымасць азнаёміцца з вынікамі галасавання па кожным выбарчым участку (ад №1 да №50) горада Мазыра: 4 лістапада намеснік старшыні Мазырскага райвыканкаму паведаміў толькі тое, што «уся неабходная інфармацыя аб выніках падліку галасоў размешчана на афіцыйным сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі».

У суд Маскоўскага раену г.Мінска Дзянісам Турчаняком падавалася скарга на дзеянні ЦВК.У прыватнасці, на тое, што ЦВК не забяспечыла УВК асобнымі пячаткамі для апячатвання скрыняў для галасавання. Усе УВК маюць аднолькавыя пячаткі, што стварае сур'ёзныя пагрозы для захаванасці бюлэтэняў, асабліва падчас датэрміновага галасавання. Судом адмоўлена ў разглядзе скаргі за непадведамаснасцю. Такая пазіцыя была падтрымана і Мінскім гарадзскім судом. Суды спасылаліся на тое, што ўстанаўленне ўзораў пячатак УВК, а таксама вызначэнне мер па забеспячэнні захаванасці скрыняў для галасавання з'яўляецца выключнай кампетэнцыяй ЦВК. Таму, на думку суда, такія скаргі не могуць быць разгледжаны судом.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ

Змены ВК апошніх гадоў не ўлічылі большасць рэкамендацый АБСЕ і Венецыянскай камісіі, якія былі зроблены па выніках назіранні за папярэднімі выбарчымі кампаніямі. Большасць гэтых рэкамендацый не страціла сваю актуальнасць і пасля выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2015 г. Выбары паказалі, што без дэталёвай рэгламентацыі парадку фарміравання выбарчых камісій, галасавання і падліку галасоў немагчыма забяспечыць правядзенне выбараў, якія б адпавядалі міжнародным стандартам у галіне свабодных і справядлівых выбараў, у прыватнасці, Капенгагенскаму дакументу АБСЕ 1990 года.

Выбарчая кампанія таксама засведчыла неабходнасць забеспячэння рэальнай роўнасці кандыдатаў у сферы доступу да сродкаў масавай інфармацыі і пашырэння правоў назіральнікаў. Змены ў выбарчых заканадаўстве, прапанаваныя ніжэй, дазволяць наблізіць

выбары да міжнародных стандартаў, а таксама павялічыць давер да вынікаў выбараў як з боку грамадзян Беларусі, так і з боку міжнароднай супольнасці.

**Выбарчыя камісіі**

У Выбарчы кодэкс трэба закласці норму, якая б стварала гарантыі прысутнасці ў выбарчых камісіях прадстаўнікоў палітычных партый і забяспечвала плюралістычны склад камісій. Неабходна забяспечыць, каб палітычныя партыі, якая прынялі ўдзел у выбарчай кампаніі, у тым ліку прэзідэнцкай, мелі права дэлегаваць аднаго прадстаўніка ў кожную з тэрытарыяльных, акруговых і ўчастковых выбарчых камісій. І толькі ў выпадку, калі палітычная партыя не скарысталася такім правам, мясцовыя распарадчыя і выканаўчыя органы атрымаюць права самастойна запаўняць вакантныя месцы ў выбарчых камісіях. Аналагічным чынам першачарговае права вылучаць сваіх прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі павіны мець кандыдаты ў прэзідэнты. Акрамя таго, трэба заканадаўча вызначыць крытэры для кандыдатаў у склад выбарчых камісій (дэлегаванне палітычнай партыяй, адукацыя, іншыя прафесійныя веды), якія б зменшылі магчымасці адвольнага іх прызначэння і маглі б ацэньвацца судом пры разглядзе адпаведных скаргаў.

**Рэгістрацыя кандыдатаў**

Неабходна выключыць магчымасць выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу пры зборы подпісаў, у прыватнасці, забараніць збор подпісаў не сябрамі ініцыятыўных груп. Акрамя таго, трэба прадугледзець права назіральнікаў прысутнічаць пры праверцы подпісаў за вылучэнне кандыдатаў.

**Спісы выбаршчыкаў**

Для павелічэння празрыстасці і падсправаздачнасці працэсу рэгістрацыі выбаршчыкаў, неабходна стварыць агульнанацыянальны спіс выбаршчыкаў. Грамадзянам і назіральнікам (у тым ліку даверaным асобам, прадстаўнікам СМІ і міжнародным назіральнікам) павінен быць дадзены поўны доступ да спісаў. Кожны грамадзянін павінен мець права знаёміцца са спісамі выбаршчыкаў да пачатку галасавання. Акрамя таго, назіральнікі павінны мець магчымасць знаёміцца са спісамі выбаршчыкаў падчас галасавання. Колькасць выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастку для галасавання, павінна абвяшчацца выбарчымі камісіямі як напярэдадні галасавання, так і пасля яго заканчэння. Унясенне зменаў у спіс выбаршчыкаў пасля пачатку галасавання можа дапускацца толькі па рашэнні суда.

**Фінансаванне выбараў**

Замацаваная ВК норма дазваляе самастойнае выкарыстанне ЦВК сродкаў дзяржаўнага бюджэту на выраб інфармацыйных улетак з агульнымі дадзенымі кандыдатаў замест фінансавання іх выдаткаў на агітацыйныя друкаваныя матэтыялы. Гэта прывяло да нізкай актыўнасці большай часткі кандыдатаў у вырабе агітацыйных матэрыялаў. Таму трэба на заканадаўчым узроўні вярнуць дзяржаўнае фінансаванне выдаткаў кандыдатаў па вырабу друкаванай агітацыйнай прадукцыі.
Інфармацыя аб крыніцах напаўнення і аб'еме і накірунках расходвання выбарчых фондаў кандыдатаў павінна быць даступнай для назіральнікаў.

**Перадвыбарчая агітацыя**

Заканадаўства прадугледжвае працягласць перыяду перадвыбарчай агітацыі не больш за адзін месяц. Такі тэрмін агітацыі абмяжоўвае як кандыдатаў у магчымасці агітацыі, так і грамадзян у атрыманні поўнай інфармацыі аб кандыдатах і іх праграмах. Прапаноўваецца павялічыць тэрмін агітацыйнай кампаніі як мінімум да двух месяцаў. Акрамя таго, неабходна

гарантаваць суб’ектам, якія размяшчаюць палітычную рэкламу, немагчымасць нясення адказнасці за змест рэкламы, якую прадаставілі кандыдаты ці палітычныя партыі.

**Судовае абскарджванне рашэнняў, звязаных з выбарамі**

ВК прадугледжвае абмежаваны пералік падставаў для звароту ў судовыя органы. Неабходна прадугледзець магчымасць судовага абскарджання любых рашэнняў выбарчых камісій і іншых дзяржаўных органаў у пытаннях, датычных выбараў. У першую чаргу, неабходна забяспечыць магчымасць судовага абскарджання пастановы ЦВК, якая зацвярджае вынікі выбараў.

**Датэрміновае галасаванне**

Працэдура датэрміновага галасаваня ў яе сённяшнім выглядзе дазваляе ажыцяўляць розныя маніпуляцыі. У сувязі з гэтым прапаноўваецца разгледзець магчымасць поўнай адмены датэрміновага галасавання. У выпадку, калі датэрміновае галасаванне не будзе адмененае, прапаноўваюцца наступныя змены: увесці крытэры, адпаведнасць якім дае выбаршчыку права на датэрміновае галасаванне. Такімі крытэрамі павінны быць падставы, якія адназначна сведчаць аб немагчымасці для выбаршчыка ўзяць удзел у галасаванні ў дзень выбараў, напрыклад, ад’езд за мяжу, і іншыя дакументальна пацверджаныя доказы. Трэба таксама заканадаўча дэталізаваць працэдуры захавання выбарчых скрыняў падчас датэрміновага галасавання, апячатвання памяшканняў, дзе знаходзіцца выбарчая скрыня. Неабходна забараніць знаходжанне пабочных асобаў, у тым ліку супрацоўнікаў міліцыі, у памяшканнях для галасавання і пакоях, у якіх захоўваюцца выбарчыя скрыні, бюлетэні і іншыя матэрыялы па выбарах. Таксама неабходна прадугледзіць права назіральнікаў знаходзіцца ў памяшканнях для галасавання па-за часам працы выбарчых камісій (перапынак на абед, перыяд пасля заканчэння галасавання) у выпадках, калі там застаюцца сябры выбарчых камісій. Забяспечыць усе УВК празрыстымі цэльнымі выбарчымі скрынямі з пластыкавымі стужкамі для апячатвання (з індывідуальным нумарам выбарчага ўчастка).

**Галасаванне па месцы знаходжання выбаршчыка**

Вызначыць, што правам на галасаванне па месцы знаходжання карыстаюца выбаршчыкі са значнымі пашкоджаннямі здароўя (пацвярджэнне дакументам медычнай установы), што не дазваляюць яму самастойна з’явіца на ўчастак для галасавання. Трэба замацаваць у ВК, што права на такое галасаванне ўзнікае ў выбаршчыка толькі пасля перадачы ў УВК да дня галасавання пісьмовай заявы аб немагчымасці галасавання на выбарчым участку.

**Падлік галасоў**

Дзейсная працэдура падліку галасоў не з’яўляецца празрыстай. Адна з асноўных прычын – адсутнасць дэталізацыі працэдуры падліку галасоў у ВК. У сувязі з гэтым варта заканадаўча замацаваць наступныя прынцыпы працэдуры падліку галасоў: падлік галасоў праводзіцца галосна ў прысутнасці назіральнікаў, якія могуць сачыць за правільнасцю падліку волевыяўлення выбаршчыкаў у кожным бюлетэні (г.зн. бачыць змест кожнага бюлетэня); падлік галасоў праводзіцца адным з сяброў камісіі, які агучвае і дэманструе ўсім сябрам камісіі і назіральнікам кожны бюлетэнь; падлік галасоў ажыццяўляецца асобна па кожнай скрыні для галасавання, вынікі такога асобнага падліку галасоў асобна па кожнай скрыні адлюстроўваюцца ў выніковым пратаколе. Копія выніковага пратаколу, завераная старшынёй і сакратаром камісіі і замацаваная пячаткай, выдаецца назіральніку па яго просьбе. Таксама прапануецца замацаваць права зарэгістраваных у ТВК назіральнікаў і давераных асоб кандытатаў непасрэдна прысутнічаць і назіраць за працэдурамі перадачы выбарчых

бюлетэняў і пратаколаў з вынікамі галасавання з участкаў для галасавання ў тэрытарыяльныя камісіі.

**Назіранне за выбарамі**

У мэтах павышэння даверу да выбараў у Беларусі неабходна заканадаўча пашырыць правы назіральнікаў. Назіральнікі мусяць мець магчымасць бесперашкодна прысутнічаць на любых мерапрыествах і падзеях, звязаных з выбарамі, а таксама знаёміцца з матэрыяламі камісіі, якія датычацца яе складу, шляхоў вылучэння ў яе сяброў, спісаў выбаршчыкаў, захавання выбарчых бюлетэняў і скрыняў падчас датэрміновага галасавання.

**СПІС ПРЫНЯТЫХ СКАРАЧЭННЯЎ**

АБСЕ – Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе

Беларускі саюз жанчын – Грамадскае аб’яднанне «Беларускі саюз жанчын»

Белая Русь – Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Белая Русь»

БДІПЧ АБСЕ – Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе

БРСМ – Грамадскае аб’яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі»

БХК – Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб’яднанне «Беларускі Хельсінкскі камітэт»

ВК – Выбарчы кодэкс Рэспублікі Беларусь

ГА – грамадская арганізацыя

Каляндарны план – Каляндарны план арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

ПАСЕ – Парламенцкая Асамблея Савета Еўропы

ПАСНД – Парламенцкая Асамблея Садружнасці Незалежных Дзяржаў

ППНС – Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Рух «За Свабоду» – Праваабаронча-асветніцкае грамадскае аб’яднанне Рух «За Свабоду»

СНД – Саюз незалежных дзяржаў

ТВК – тэрытарыяльная выбарчая камісія

УВК – участковая выбарчая камісія

ЦВК/Цэнтральная камісія – Цэнтральная камісія Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.